View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# АДЗІНСТВА І БАЯВАЯ САДРУЖНАСЦЬ НАРОДАЎ СССР У ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ – ГАЛОЎНЫЯ СКЛАДАЮЧЫЯ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ

Л. Л. Шкуцько, Г. А. Шкуцько, г. Мінск

З першых гадзін Вялікай Айчыннай вайны на абарону Радзімы падняліся ўсе народы краіны. Разгарнулася жорсткая барацьба. Першы ўдар прынялі на сябе пагранічнікі. На працягу дзесяці гадзін вялі безперапынныя баі пагранічнікі 4-ай заставы пад камандаваннем старшага лейтэнанта, прадстаўніка рускага народа І. Г. Ціханава. За тыдзень баёў каля батальёна гітлераўцаў знішчылі байцы 9-ай пагранзаставы, якая знаходзілася ў заходняй частцы Брэсцскай крэпасці, пад камандаваннем выхадца з Мардовіі лейтэнанта А. Кіжаватава. Амаль восем гадзін стаялі насмерць 32 пагранічнікі 3-яй заставы Аўгустоўскага пагранатрада ў раёне Гродна начале з украінцам лейтэнантам В. Усавым. Дзесяць разоў хадзілі ў атаку супраць фашыстаў байцы заставы. 27 войнаў, у тым ліку і В. Усаў, загінулі смерцю герояў. В. Усаву пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Больш месяца змагаўся, акружаны ворагам, гарнізон Брэсцкай крэпасці. У ліку 3,5 тысяч яе абаронцаў былі прадстаўнікі больш 30 нацыянальнасцей: рускія – І. Зубачоў, І. Вінаградаў, беларус – У. Шаблоўскі, украінец – Р. Семянюк, армянін – С. Мацевасян, азербайджанец – А. Абдулаеў, таджык – А. Абдурахманаў, татарын – П. Гаўрылаў і інш. За мужнасць і адвагу абаронцаў крэпасці ёй прысвоена званне “Крэпасць-герой”. П. Гаўрылаў і А. Кіжаватаў (пасмяротна) удастоены звання Героя Савецкага Саюза. Каля 150 абаронцаў крэпасці ўзнагароджаны ардэнамі і медалямі. [1, с. 11-12]

У складзе Чырвонай Арміі дзейнічалі воінскія злучэнні сфарміраваныя ў Казахстане, Латвіі, Літве і іншых рэспубліках СССР. У баях пад Масквой мужна змагаліся байцы 316-ай стралковай дывізіі начале з генералам І. Панфілавым, сфарміраванай ў Казахстане. Усяго ж у гэтай рэспубліцы было створана больш 12 воінскіх злучэнняў. Тут жа пад Масквой пачала свой баявы шлях 201-ая латышская дывізія, пераіменаваная за гераізм у 43-ю гвардзейскую. У 1944 г. была створана 308-ая латышкая стралковая дывізія, якую аб’ядналі з 43-яй дывізіяй у 130-ы латышскі стралковы корпус. У радах Чырвонай арміі змагаўся і латышскі авіяцыйны полк. У 1942 г. у баявые дзеянні ўступілі 8-ы эстонскі корпус, 16-ая літоўская стралковая дывізія. [2, с. 187]

Згодна з пастановай ДКА ад 13 лістапада 1941 г. у Сярэдняй Азіі, Казахстане, Башкірыі, Калмыкіі,на Каўказе было сфарміравана, па няпоўных дадзеных, 15 нацыянальных стралковых брыгад, 20 кавалерыйскіх і 14 нацыянальных стралковых дывізій. З Узбекістана прыбылі на фронт 258-ая, 21-ая і 44-ая дывізіі. За баявы гераізм 258-ая дывізія ў студзені 1942 г. стала гвардзейскай. У Кіргізіі была сфарміравана 40-ая стралковая брыгада, 385-ая брыгада – у Туркменіі, 112-ая кавалерыйская брыгада – у Башкірыі. За мужнасць войнаў яна была ўзнагароджана ардэнамі Леніна, Чырвонага сцяга, Суворава,Кутузава. [3, с. 90] У асноўным, з ліку

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

асоб грузінскай нацыянальнасці былі ўкамплектаваны 349-ая, 276-ая, 392-ая стралковыя дывізіі. 402-ая, 416-ая дывізіі фарміраваліся ў Азербайджане, 89-ая, 390-ая, 261-ая – у Арменіі. Больш паловы асабовага складу 195-ай стралковай дывізіі, сфарміраванай у Чкалаўскай вобласці, складалі казахі і татары. Тры кавалерыйскія дывізіі, дзве стралковыя брыгады былі створаны на тэрыторыі Таджыкістана.[4 , с. 35 - 50] Па ініцыятыве камсамольцаў Вінніцкай вобласці Украіны быў сфарміраваны 38-ы інжынерны полк, пераіменаваны пазней у 41-ую штурмавую інжынерна-сапёрную брыгаду. 174-ы асобны супрацьтанкавы дывізіён быў сфарміраваны па ініцыятыве і на сродкі камсамольцаў Удмуртыі. [2, с. 188]

У складзе 62-ой арміі, якая адыграла выключную ролю ў абароне Сталінграда, змагаліся воіны 20 нацый і народнасцей СССР. Акрамя рускіх, беларусаў і ўкраінцаў сярод іх было каля 4 тысяч казахаў, 2 тысячы татар, 700 узбекаў, 530 армян, 420 грузін - і г. д. [3, с.90] Храбра змагаліся на Сталінградскім фронце байцы і камандзіры 38-ай стралковай дывізіі пад камандаваннем прадстаўніка татарскага народа палкоўніка Г. Сафіуліна. За гераізм дывізія была пераіменавана ў 73-ю гвардзейскую і атрымала назву “Сталінградскай”, а больш 2-х тысяч салдат і афіцэраў былі узнагароджаны ардэнамі і медалямі. У складзе гэтага злучэння ваявалі прадстаўнікі звыш 30-ці нацыянальнасцей. У баях пад Арлом геройскі праявіла сябе 5-ая стралковая дывізія пад камандаваннем прадстаўніка рускага народа палкоўніка П. Міхаліцына. У яе складзе змагаліся з ворагам воіны больш 40 нацыянальнасцей СССР. Толькі за баі пад Арлом дывізія двойчы атрымоўвала падзяку Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, ёй было прысвоена ганаровае званне “Арлоўскай”. Усяго за гады вайны было сфарміравана больш 60 нацыянальных воінскіх злучэнняў, у тым ліку 2 стралковыя карпусы, 20 стралковых і 20 кавалерыйскіх дывізій, 15 асобных брыгад, 1 авіацыйны полк і інш. [3, с. 90]

Прадстаўнікі больш 50-ці нацый уваходзілі ў склад генералітэту і афіцэрскага састава Чырвонай Арміі. Сярод іх – рускія Г. Жукаў, А. Радзімцаў, В. Чуйкоў, украінец – А. Чарняхоўскі, армянін – І. Баграмян, латыш – Я. Фогель, выхадцы з Беларусі – І. Якубоўскі, С. Красоўскі, А. Бацюня, В. Сакалоўскі і мн. інш.

Сярод 11603 Герояў Савецкага Саюза былі прадстаўнікі 100 нацый і народнасцей – 8180 рускіх, 2072 украінца, 443 беларусы, 161 татарын, 108 яўрэяў, 96 казахаў, 91 грузін, 69 узбекаў, 61 мардвін, 44 чувашы, 43 азербайджанцы, 35 башкіраў, 18 марыйцаў, 32 асеціны, 18 туркмен, 13 латышоў, 12 кіргізаў, 5 абхазцаў, 3 якуты і г.д. Усяго на 1 ліпеня 1947 г. ардэнамі і медалямі Савецкага Саюза былі ўзнагароджаны воіны 143 нацыянальнасцей. Больш за 11 тыс. воінскіх злучэнняў, сфарміраваных ў розных рэспубліках краіны, за гераізм былі узнагароджаны ардэнамі СССР. Звыш 300 прадстаўнікоў розных народаў паўтарылі подзвіг А. Матросава. Сярод іх – рускі А. Панкратаў, узбек Т. Эрджыгітаў, эстонец І. Лаар, малдаванін І. Солтыс, беларус П. Купрыянаў і інш.; 330 – М. Гастэлы, больш 600 лётчыкаў здейснілі паветраны таран, а лётчык-беларус Б. Коўзан тараніў варожыя самалёты чатырыжды. Сярод двойчы Герояў Савецкага Саюза былі чатыры беларусы – П. Галавачоў, С. Шутаў, І. Гусакоўскі, І. Якубоўскі, а таксама прадстаўнікі іншых народаў – С. Ахмет-Хан, І. Баграмян, І. Плієў, Ц. Хрукін, А. Нядбайла, І. Чарняхоўскі і інш. [5, с. 52]

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Прадстаўнікі 73 нацый і народнасцей удзельнічалі ў партызанскім руху на тэрыторыі Беларусі. Побач з беларусамі (71,1 %) змагаліся рускія – 19,23 %, украінцы – 3,9 %, яўрэі – 2,8 %, а таксама літоўцы, латышы, казахі, узбекі і многія іншыя. Арганізатарамі і удзельнікамі партызанскай барацьбы разам з беларусамі В. Каржом, П. Машэравым, В. Казловым, Р. Мачульскім і іншымі былі прадстаўнікі рускага народа В. Лівенцаў, П. Канавалаў, Р. Такуеў, М. Канстанцінаў; украінцы І. Цімчук, А.Брынскі, У. Шчарбіна; карачаеўцы А. Касаеў, К. Кіпкееў; казахі Г. Ахмедзьяраў, Х. Ісмагулаў; таджык І. Таіраў; марыец Р. Ахоцін; грузіны І. Шубітыдзе, В. Талаквадзе; узбекі Г. Ташніязаў, М. Тапвалдыеў; латыш І. Юкса; яўрэй С. Свярдлоў і многія іншыя. Толькі ў партызанскай брыгадзе “Разгром”, якая дзейнічала на Міншчыне, было прадстаўлена больш чым 25 нацыянальнасцей, у брыгадзе імя Данукалава на Віцебшчыне – 21, а ў брыгадзе імя В. Чкалава, якая вяла баявые дзеянні ў Баранавіцкай вобласці – 29. Камандаваў брыгадай рускі М. Грыбанаў, камісарам быў беларус І. Казак, начальнікам штаба – украінец І. Анішчанка, начальнікам разведкі – абхазец Д. Зухба. Камандзірамі атрадаў з’яўляліся карачаевец К. Кінкееў і татарын В. Шакіраў. Усяго ў складзе брыгады знаходзілася 638 беларусаў, 292 рускіх, 47 украінцаў, больш 100 прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей. [1, с. 50-51] Пяты атрад брыгады “Чэкіст”, якая дзейнічала ў Магілёўскай вобласці, называлі “поўны інтэрнацыянал”. Камандзірам атрада быў украінец Г. Кірпіч, камісарам – беларус Ф. Сядлецкі. Сярод байцоў атрада быў рускі В. Багамолаў, казах М. Мажытаў, асецін Д. Айдараў, чуваш І Данілаў, марыец І. Хрысталюбаў і інш.[1, с.50-51] У летапісу ваеннай славы ганаровае месца займае імя партызана-казаха Ж. Маматава. Сямю ўзнагародамі, у тым ліку і ордэнам Леніна, адзначаны яго баявые дзеянні. У адным з партызанскіх атрадаў на Кобрыншчыне дзейнічала інтэрнацыянальная рота імя С. М. Кірава, якой камандаваў узбек Уракаў. На баявым рахунку роты больш за 1600 забітых гітлераўцаў, 10 разгромленых гарнізонаў, 15 пушчаных пад адгон эшэлонаў ворага. Усе партызаны роты мелі дзяржаўныя ўзнагароды, а камісар – ордэн Чырвонай Зоркі і медаль “За адвагу”. Першым Героем Савецкага Саюза сярод партызан яшчэ ў жніўні 1941 г. разам з беларусам Ц. Бумажковым стаў украінец Ф. Паўлоўскі. Гераізм партызан і падпольшчыкаў быў высока аценены краінай: звыш 130 тысяч узнагароджаны ардэнамі і медалямі, а 88 з іх удастоены высокага звання Героя Савецкага Саюза. У іх ліку – 45 беларусаў, 30 рускіх, 9 украінцаў, карачаевец А. Касаеў, літовец С. Ваўпшасаў, узбек М. Тапвалдыеў і інш.

У той жа час прадстаўнікі Беларусі мужна змагаліся ў радах народных мсціўцаў іншых абласцей і рэспублік краіны. Так, сярод украінскіх партызан, беларусы складалі да 6 %. Першым начальнікам штаба партызанскага атрада С. Каўпака, які перарос у буйное партызанскае злучэнне, быў беларус М. Курс. У адным з партызанскіх атрадаў Смаленшчыны змагаўся беларус У. Курыленка, які за праяўлены гераізм быў пасмяротна ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза. На Жытомершчыне адным з арганізатараў партызанскага руху быў прадстаўнік Беларусі Г. Шалушкоў, які таксама быў пасмяротна ўзнагароджаны залатой зоркай Героя. У многіх выпадках беларускія партызаны змагаліся з ворагам сумесна з партызанамі суседніх рэспублік. Непрыступным для ворага стаў Расонска-Асвейска-Дрысенска-Себежскі партызанскі край, дзе дзейнічалі злучэнні беларускіх, рускіх,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

латышскіх і літоўскіх партызан пад камандаваннем П. Машэрава, С. Маісеенкі, І. Судмаліса, П. Пранявічуса і інш. На тэрыторыі Петрыкаўскага, Лельчыцкага, Мазырскага раёнаў сумесна з украінскім злучэннем А. Сабурава грамілі ворага партызаны Лельчыцкага атрада. [1, с.51-54] Па тэрыторыі Магілёўшчыны і Міншчыны прайшоў баявы рэйд смаленскага партызанскага палка “Трынаццаць” пад камандаваннем Героя Савецкага Саюза С. Грышына. Сумесна з мясцовымі партызанамі яны разграмілі гітлераўцаў на чыгуначных станцыях Чавусы і Верамейкі, паралізавалі на 8 дзён рух па чыгунцы ад Крычава да Чавус. [1, с. 51]

Усюды: пры фарсіраванні Дняпра і Заходняй Дзвіны, Бярэзіны і Нёмана, вызваленні Магілёва, Мінска, Віцебска і іншых мясцін Беларусі байцы і камандзіры праяўлялі масавы гераізм. Толькі за прарыў варожай абароны і фарсіраванне Заходняй Дзвіны 145 воінаў 1-га Прыбалтыйскага фронта былі ўдастоены залатой зоркі Героя. Сярод іх: рускі - капітан М. Лугоўскі, украінец - сяржант У. Івашчанка, узбек - радавы Р. Азімаў, удмурт - сяржант К. Шакіраў, татарын - Б. Анціміраў і інш. У баях за Магілёў вызначылася штурмавая інжынерна-сапёрная брыгада, якой камандаваў палкоўнік, азербайджанец А. Везіраў. За ўдзел у вызваленні горада брыгада атрымала найменне “Магілёўскай”, а А. Везіраву было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. [3, с. 90] За мужнасць пры вызваленні толькі Магілёва 28 воінаў розных нацыянальнасцей атрымалі званне Героя Савецкага Саюза, а ўсяго гэтай высокай узнагароды за гераізм пры фарсіраванні Дняпра былі ўдастоены прадстаўнікі 33 нацыянальнасцей. 1631 воін за мужнасць і адвагу пры вызваленні Беларусі атрымаў званне Героя Савецкага Саюза. З іх – 1162 прадстаўнікі рускага народа, 235 украінцаў, 39 беларусаў, 29 татар, 26 казахаў, 20 узбекаў, 18 башкір, каля 100 прадстаўнікоў іншых народаў – рускія А. Гарбатаў, П. Ротмістраў, С. Роман, які паўтарыў подзвіг А. Матросава, украінцы П. Мірашнічэнка, М. Альшэўскі, А. Бурдзейны, танкавае злучэнне якога першым уварвалася ў Мінск, яўрэі І. Бескін, З. Гарэлік, тувінец М. Бухтуеў, мардвін І. Болдзін, азербайджанцы Г. Акпераў, А. Асланаў, А. Кулíеў, татары А. Газітулін, В. Булатаў і многія іншыя. Звыш 400 тысяч былі ўзнагароджаны ардэнамі і медалямі. Каля 600 воінскіх злучэнняў, якія праявілі гераізм пры вызваленні беларускіх гарадоў атрымалі ганаровыя званні “Мінскіх”, “Бабруйскіх”, “Магілёўскіх”, “Віцебскіх” і г. д. Пры вызваленні Беларусі Чырвоная Армія панесла вялікія страты. Загінула больш 600 тысяч чалавек, у т. л. 522 Героі Савецкага Саюза, якія прадстаўлялі 29 нацыянальнасцей. [6, с. 65] Навекі у памяці народа засталіся імёны рускіх У. Мартынава, В. Санфіравай, Ю. Смірнова, азербайджанцаў П. Абасава, Д. Гусейнава, украінцаў У. Карпенка, С. Супруна, туркмена К. Азолава, татарына Т. Ібрагімава, мардвіна П. Куманёва, чуваша П. Аляксеева, башкіра К. Ахметшына, беларуса П. Акуцыёнка і мн. інш.

У рэспубліцы няма такога месца, якое не было б сведкам народнага гераізму і няма месца, дзе б гэтыя подзвігі не ўшаноўваліся. У памяць пра тыя векапомныя дні на 21-м кіламетры шашы Мінск – Масква ўзняўся велічны Курган Славы – даніна ўдзячнасці беларускага народа сваім вызваліцелям.

У той жа час больш 1,3 млн. беларусаў змагалася на франтах вайны. Многія з іх праявілі адвагу і гераізм пад Масквой і Ленінградам, Сталінградам і на Курскай дузе, пры вызваленні іншых абласцей і рэспублік. За праяўленыя подзвігі 4

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

беларусы сталі двойчы Героямі Савецкага Саюза, 444 - Героямі Савецкага Саюза, больш 300 тысяч узнагароджаны ардэнамі і медалямі, 65 сталі поўнымі кавалерамі Ордэна Славы, 14 паўтарылі подзвіг А. Матросава, лётчыкі Б. Коўзан, І. Авекаў, Л. Муравіцкі, М. Пінчук і інш. здзейснілі паветраныя тараны, гамельчанін І. Катунін у 1944 г. паўтарыў подзвіг М. Гастелы. [7, с. 319]

Вялікае воінскае майстэрства і асабістую мужнасць у баях пад Масквой паказаў сын беларускага народа Герой Савецкага Саюза Л. Даватар. Камандуючы кавалерыйскім корпусам, у склад якога ўваходзілі прадстаўнікі многіх народаў, ён правёў глыбокі рэйд па тылах ворага. Аб ім і яго корпусе хадзілі легенды. Толькі ў першы перыяд наступлення коннікі Л. Даватара поўнасцю разбілі фашысцкую дывізію. Нажаль, у снежні 1941 г., мужны генерал загінуў у баі ля в. Палашкіна. Пасля яго смерці корпус узначаліў асецін І. Пліеў. [8, с.45] У баях пад Масквой талент ваеначальніка і асабістую мужнасць праявіў і гамельчанін, камандзір 1-ай гвардзейскай мотастралковай дывізіі А. Лізюкоў, які ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза. Пры абароне Ленінграда разлік аўтаматычнай пушкі начале з беларусам І. Шапавалавым збіў 18 варожых самалётаў. Высокую мужнасць у баях з фашыстамі праявілі таксама ўраджэнцы Беларусі лётчык І. Сяржантаў, радыстка А. Стэмпкоўская, снайперы Л. Буткевіч, В. Лукашэнка, сяржант М. Жолудзеў, генерал А. Пастрэвіч, Д. Жмуроўскі  і мн. Інш.Усім ім за храбрасць і адвагу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. [1, с. 56]

Ураджэнка Расоншчыны З. Тусналобава за 8 месяцаў баёў вынесла з поля боя больш 128 параненых. У баях пад Курскам яна сама была паранена і абмарожана, у выніку чаго ёй ампутавалі рукі і ногі. Нягледзячы на гэта, яна пасля выздараўлення актыўна займалася грамадскай дзейнасцю. З. Тусналобава -   Герой Савецкага Саюза, ганаровы грамадзянін г. Полацка. Яе мужнасць і гераізм адзначаны вышэйшай узнагародай Міжнароднага Камітэта Чырвонага Крыжа – медалём Флорэнс Націнгейл. Гэтай жа ўзнагароды ўдастоены таксама медсёстры Я. Шаўчэнка, М. Гарачук, санінструктар С. Голухава.[8, с. 45]

Многія з беларусаў, выконваючы свой свяўшчэнны абавязак, геройскі загінулі, а іх подзвігі пасмяротна адзначаны высокім званнем Героя Савецкага Саюза. У баях пад Ленінградам загінулі выхадцы з Магілёўшчыны лётчык А. Антоненка, які за 34 дні баёў збіў 11 самалётаў ворага, снайпер Ф. Смалячкоў, які знішчыў 125 фашыстаў. На Курскай дузе здейсніў подзвіг лётчык С. Гаравец, які толькі ў адным баі збіў 9 варожых самалётаў з 20, лётчык У. Жэлнін накіраваў палаючы самалёт на эшэлон з гітлераўскай тэхнікай. Пры абароне Крыма загінулі лётчыцы П. Гельман і Г. Дакутовіч, у баях за Украіну аддаў сваё жыццё А. Волах, Латвію – П. Рубіс і П. Купрыянаў, Літву – Р. Кавалёў і інш. Многія прадстаўнікі Беларусі здзейснілі свае подзвігі пры вызваленні родных мясцін. Сярод іх можна назваць ураджэнцаў Клічава -  танкіста П. Крываноса, Міншчыны -  капітана А. Чарныша, Жлобіншчыны – М. Барташова і многіх іншых.

Такім чынам, баявая садружнасць народаў СССР у Вялікай Айчынай вайне стала адной з важнейшых крыніц, забяспечыўшых перамогу над нацысцкай Германіяй.

Літаратура і крыніцы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Ковшаров, Н. Д. Беларусь в годы Великой Отечественной войны (1941 – 1945) / Н. Д. Ковшаров. – Минск : 1997. – 93 с.
2. Кирсанов, Н. А. Боевое содружество народов СССР в Великой Отечественной войне 1941 – 1945г.г. / Н. А. Кирсанов // Великая Отечественная война (историография). Сб. обзоров. – М., 1995. – 199 с.
3. Аюпов, Р. С., Мухаметдинов, Г. Р. Интернациональное воспитание студентов на героике Великой Отечественной войны / Р. С. Аюпов, Г. Р. Мухаметдинов // 45 лет Великой Победы: итоги и уроки: Тезисы докладов и сообщений межвуз. науч.-теор. конф., Гродно, 17.04.1990 г. / Гродн. госуд. ун-т . – Гродно, 1990. – 164 с.
4. Артемьев, А. П. Братский боевой союз народов СССР в Великой Отечественной войне. / А. П. Артемьев. - М : Изд-во Мысль, 1975. – 199 с.
5. Бурлаков, А. И. Уроженцы белорусской земли в боях за Родину в годы Великой Отечественной войны / А. И. Бурлаков // 45 лет Великой Победы: итоги и уроки: Тезисы докладов и сообщений межвуз. науч.-теор. конф., Гродно, 17.04.1990 г. / Гродн. госуд. ун-т . – Гродно, 1990. – 164 с.
6. Киселёв, Т. Я. Советская Белоруссия / Т. Я. Киселев. - Москва: Политиздат, 1982. – 126 с.
7. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / Бел. акад. навук, Ін-т гісторыі; М. П. Касцюк, І. М. Ігнаценка, У. І. Вышынскі [і інш.]. – Мінск: Беларусь, 1995. – Ч. 2. – 560 с.
8. Трыгорлава, Л. Уклад беларускага народа ў Перамогу над фашыстскай Германіяй / Л. Трыгорлава // Беларус. гіст. часоп. – 2010. - № 4. – С.45 –55.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ